# Слова краязнаўцы



**Вячка КРАСУЛІН, выпускнік БДУКіМ (спецыялізацыя "Этнафоназнаўства") разважае пра дударскую музыку як неад'емную частку беларускай этнічнай культуры:**

— Найстарэйшая беларуская дуда 1877 года знаходзіцца ў экспазіцыі Лепельскага раённага краязнаўчага музея. Але, на жаль, гэта адзіны аўтэнтычны інструмент, які захаваўся цалкам. Вядома, што дуду можна пабачыць яшчэ ў Санкт-Пецярбургскім этнаграфічным музеі, а мацянку (яе разнавіднасць) — у Літоўскім краязнаўчым музеі ў Вільнюсе.

Яшчэ ў 1930-я гады дуда была надзвычай папулярная, выканаўцаў на ёй савецкія ўлады ахвотна запрашалі на рэгулярныя выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскву. Аднак паступова гэты інструмент быў выцеснены з побыту вёскі гармонікам. Апошняе афіцыйна зафіксаванае выступленне дудара адбылося на фестывалі народнай творчасці ў Полацку ў 1951 годзе.

Можна сцвярджаць, што "жывая" традыцыя дударства (калі перайманне адбываецца "з рукі на руку", пры непасрэдным кантакце) амаль знікла ў 1950 — 1960-я гады. Далей пра дуду ў Беларусі амаль нічога не было чуваць да канца XX стагоддзя. Але дзякуючы намаганням майстроў музычных інструментаў У. Пузыні, У. Грома, В. Кульпіна, А. Лася, Т. Кашкурэвіча, А. Журы дуду вярнулі "да жыцця". У XXI стагоддзі з'яўляюцца новыя майстры і музыкі-дудары, якія спрыяюць адраджэнню дударскай традыцыі ў Беларусі. У 2007 годзе ў Маскве з фанографа былі алічбаваны запісы дудароў Сцяпана (Стахвана) Шахаўца і Фёдара (Хведара) Стэся, зробленыя ў 1931 годзе на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. Помнікі аўтэнтычнай дударскай школы Беларусі часткова захаваліся сёння ў адносна добрым стане, іншыя патрабуюць узнаўлення.

Для рэканструкцыі і рэвіталізацыі дударскай традыцыйнай музыкі трэба карыстацца артэфактамі, якія фіксуюць аўтэнтычную традыцыю, выкарыстоўваць вопыт даследаванняў этнамузыколагаў. Гэта надзвычай важна, бо адnaўленне дударскай музыкі спрыяе захаванню нашага народа як этнічнай адзінкі, аб'яднанай агульнымі каштоўнасцямі і памкненнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ